**Таццяна Камароўская**
*Белдзяржуніверсітэт (Мінск)*

# ПАДАБЕНСТВА ЖАНРАВЫХ ФОРМ АМЕРЫКАНСКАГА І БЕЛАРУСКАГА ГІСТАРЫЧНАГА РАМАНА ХХ СТАГОДДЗЯ

# PODOBIEŃSTWA FORM GATUNKOWYCH AMERYKAŃSKIEJ I BIAŁORUSKIEJ POWIEŚCI HISTORYCZNEJ XX WIEKU

**Ключавыя словы:** жанравая форма, традыцыйны раман, гістарычны раман, філасофія гісторыі, гістарычнае прызначэнне

Натаніэль Готарн, вялікі амерыканскі пісьменнік, стварыў у амерыканскай літаратуры новую жанравую форму – romance, рамантычны раман, і апісаў яе ў прадмове да рамана «*Дом о семи фронтонах*» (1831г.). Готарн, гэта пурытанскае сумленне Амерыкі, падкрэсліваў у прадмове важнасць як маральнага складніка гэтага тыпу рамана, так і значэнне яго мастацкай формы.[1] Romance, рамантычны раман Н.Готарна – гэта азначэнне не творчага метаду, а жанравай формы рамана (romance), які, у адрозненне ад novel, рамана ўвогуле, характарызуецца камернасцю, засяроджанасцю на псіхалагічным жыцці герояў, глыбокім даследаваннем іх унутранага свету, які адлюстроўвае свет сацыяльны; увагай да мастацкай формы твора. Romance, існуючы побач з традыцыйным раманам, novel, атрымаў вялікае распаўсюджанне ў літаратуры ЗША, у прыватнасці, у гістарычным рамане Амерыкі. Варта адзначыць, што мы знаходзім гэту жанравую форму і ў беларускім гістарычным рамане. Раман Уладзіміра Караткевіча «*Каласы пад сярпом тваім*» – гэта таксама romance. У якасці доказу звернемся да двух гістарычных раманаў, амерыканскага і беларускага, прысвечаных фактычна аднаму перыяду сусветнай гісторыі.

---

1 *Reader's Encyclopedia of American Literature*, red. G. Perkins, New York 2002.

Даніэль Аарон, навуковец і крытык, даследуючы тэму Грамадзянскай вайны ў творчасці амерыканскіх пісьменнікаў, адзначае, што яна выклікала большую колькасць гістарычных даследаванняў, біяграфій, мемуараў, гістарычнай белетрыстыкі і паэзіі, чым усе разам узятыя іншыя амерыканскія войны. Прычыну такой з'явы даследчык тлумачыць словамі Томаса Біяра: «вайна насамрэч скончылася ў 1865 годзе, але яе палітычныя наступствы могуць выявіцца і ў 3000 годзе».[2]

Разам з тым да 20-х гадоў наступнага стагоддзя Грамадзянская вайна не спрыяла паяўленню ніводнага шэдэўра, акрамя "*Пунсовага знака гераізму*" Сцівена Крэйна. Шэрвуд Андэрсан меў усе падставы сказаць ў 1916 годзе, што «яе сапраўдны дух яшчэ не трапіў на старонкі друкаванай кнігі» [3]. На гэта былі дзве асноўныя прычыны. Першая з іх – адсутнасць патрэбнай гістарычнай перспектывы, праз якую можна было б аб'ектыўна ацаніць гістарычную значэнне вайны паміж Поўначчу і Поўднем; па словах літаратурнага крытыка «Скрібнез Мэгэзін",

> пісьменнік сярэдняга ўзросту ў 1900-я гады занадта малады, каб самому быць удзельнікам вайны, але занадта блізка да яе, каб успрымаць яе як эпас[4].

Другая прычына выклікана засіллем літаратурнай традыцыі "далікатнага рэалізму", што выключала, па словах Аарона,

> некаторага роду досвет, і не дзіва, што тэрыторыя простага салдата была выведзена за межы літаратуры амерыканскімі цэнзарамі ад культуры [5].

Бліскучыя набыткі рэалізму ў амерыканскай літаратуры ў 20-я гады зрабілі гэту тэрыторыю нарэшце даступнай для эстэтычнага засваення гістарычнымі раманістамі і спрыялі паяўленню новага тыпу гістарычнага рамана пра Грамадзянскую вайну, пра які Фрэд У. Міллет пісаў, што

> рэалізм і імпрэсіянізм негістарычнага сучаснага рамана нарэшце спарадзілі тып рамана, рамантычнага па тону, але традыцыйнага [альбо рэалістычнага – Т.К.] па тэхніцы ліста[6].

---

2 D. Aaron, *An Unwritten War. American Writers and the Civil War*, New York 1973, p. XIII.
3 D. Aaron, op. cit., p. XIII.
4 Цыт. па: *Scribner's Magazine,* XXXV-1904, Jan.-June., p. 764.
5 D. Aaron, op. cit., p. XVII.
6 F.B. Millett, *Contemporary American Authors*, New York 1944, p. 60.

Амерыканскай гісторыі ўласцівы кансенсус, і амерыканскі гістарычны раман XX стагоддзя пра Грамадзянскую вайну з'яўляецца ілюстрацыяй гэтай тэзы, хоць ён і прысвечаны антаганісцкаму канфлікту ў жыцці краіны, якім была Грамадзянская вайна. Амерыканскі гістарычны раман 20-30-х гадоў падкрэслена пацыфіскі. Аўтары гістарычных раманаў пра Грамадзянскую вайну (М. Кэнтар, Х. Ален) адмаўляюцца ад глыбокага сацыяльнага аналізу яе прычын і характару і трактуюць вайну як трагедыю для абодвух бакоў, што выклікае пераасэнсаванне канцэпта «іншый», уласцівага творам пра вайну.

Філасофія гісторыі Алена Хэрві, палітычная ідэя і ідэал якога – мір, сродак іх дасягнення – каханне, а вайна увогуле і ў тым ліку Грамадзянская – злачынства супраць асобы, вынік інтрыг палітыкаў, іх няздольнасці вырашаць супярэчнасці мірным шляхам, абумовілі тэму рамана, вынесеную ў загаловак, – "*Бітва пры Аквіле*" (1937). Бітва пры Аквіле была адной з самых нязначных падзей Грамадзянскай вайны – манеўр з боку Канфедэратаў, вызначаны ашукаць ворага, каб без перашкод адвесці рэштку войск да Рычманда. Гісторыкі амаль праігнаравалі яе. «Пра яе наўрад ці ведалі досыць добра, каб забыцца, на яе проста адразу не звярнулі ўвагі», – са смуткам канстатуе аўтар. Але сотні людзей былі забіты і пакалечаны там, і таму для аўтара яна не менш цікавая, чым вялікія бітвы, што вырашалі вынік вайны. Непатрэбнае геройства і неапраўданыя ахвяры – вось што такое, на думку Алена, гэтая бітва, фрагмент манеўру коніцы ў той лістападаўскі дзень, ды і ўся Грамадзянская вайна ў цэлым, што ён і падкрэслівае ўсімі сваімі разважаннямі, пабудовай сюжэта, расстаноўкай галоўных персанажаў, выбарам герояў і своеасаблівасцю тыпізацыі, што ляжыць у аснове стварэння іх вобразаў. На адным боку – палітычныя сілы і разважанні, на другім – дабрыня, мужнасць людзей, іх каханне. Для адлюстравання сваёй глыбока гуманнай ідэі пра Вайну і Мір аўтар стварае характары, якія вылучаюцца агульначалавечымі рысамі, вобразы Мужчыны і Жанчыны, якія ва ўмовах вар’яцтва вайны шукаюць і знаходзяць шляхі да людскасці, да існавання, хаця б у іх жыццях, вечных каштоўнасцяў. Выратаванне, на думку аўтара, ляжыць па-за палітыкай, у сферы чалавечых стасункаў. Перадапошняя частка рамана мае назву "Непарушны Саюз" – ідэалагічнае клішэ, якое было распаўсюджана на Поўначы ў час Грамадзянскай вайны. Але гаворка ў ёй ідзе не пра звяз штатаў, дзеля захавання якога вайна і вялася, а пра звяз сапраўды непарушны, звяз паміж мужчынай з Паўноччы

і жанчынай з Поўдня, якія пакахалі адзін аднаго і разам пераадолелі смерць зімой у замеценай снегам хаце ў гарах. Дабрыня, каханне, спагада, узаемапаразуменне абараняюць, на думку аўтара, свет і жыццё, а не палітыка і вайна.

Філасофія гісторыі аўтара вызначае і канфлікт у яго рамане. У "*Бітве пры Аквіле*" канфлікт падвоены. Менш значны – вонкавы, ён выяўлены ў сутыкненні пры Аквіле войск паўднёўцаў і паўночнікаў, гэта канфлікт палітычны, ваенны. Але для выяўлення аўтарскай ідэі больш важны канфлікт унутраны, псіхалагічны – канфлікт чалавека з вайной і яе жорсткасцю, што бачна ў непрыманні героямі бесчалавечнасці вайны з яе чалавеканенавісніцкай ідэалогіяй. «Іншага» няма ў гэтым рамане пра Грамадзянскую вайну.

Як ні парадаксальна, у сцэне бітвы пры Аквіле няма ваеных герояў. Падчас жорсткай бойні сапраўднымі героямі, на думку аўтара, з'яўляюцца не тыя, хто знішчае адзін аднаго, хай сабе і ў імя высокай мэты, але тыя, хто спрабуе выратаваць людзей, хто захоўвае дабрыню і каханне: дактары Хольцмайер і Уілсан, якія хоць і належаць да варагуючых бакоў, але аперуюць на суседніх сталах як сваіх, так і чужых; місіс Крыттэндэн, якая прыйшла ім на дапамогу; Маргарэт Крыттэндэн і Флосі, якія заснежанай ноччу адшукваюць на полі бою параненых.

Аўтар рамана безумоўна за звяз штатаў, але саюз гэты павінен быць забяспечаны не ваенным шляхам. Па-свойму адгукаючыся на ідэю месіянскай ролі ЗША, уласцівую афіцыёзнай ідэалогіі і масавай свядомасці, ідэю, якая з’яўлялася адным з нарожных камянёў нацыянальнай міфалогіі, Ален бачыць яе ў тым, каб яго краіна бараніла мір ва ўсім свеце:

> Гэтыя благаславёныя горы, што ўздымаюцца адна за другой, калыхалі калыску новай, хутчэй што, лепшай расы – паўночнаамерыканскай. А надзеяй гэтай расы быў мір. Таму калі што і было ў Амерыцы "новае і лепшае", дык гэта надзея на мір – мір на больш надзейным, шырокім кантынентальным узроўні, якога яшчэ ніколі не атрымоўвалася дасягнуць[7].

Ален не прызнае гістарычна-прагрэсіўнае значэнне Грамадзянскай вайны і перамогі Поўначы, гэта асабліва ярка дэманструе эпілог рамана. У ім амаль 80-гадовы герой прыязджае ў Філадэльфію на праводзіны

---

[7] H. Allen, *Action at Aquile*, New York, 1938, p. 72-73.

дабраахвотнікаў на Іспанскую вайну. Ваяўнічы патрыятызм і пампезныя размовы нагадваюць яму аналагічныя імпрэзы ў дні яго сталасці (Грамадзянская вайна) і юнацтва (Мексіканская вайна). Са з'едлівым сарказмам высмейвае ён палітыканаў, што замыкаюць урачыстую працэсію, параўноўваючы іх з прастытуткай часоў Грамадзянскай вайны, якая са сваім бардэлем хоча не адстаць ад войска і тлумачыць сваю зухаватасць патрыятычнымі пачуццямі – тым менавіта, што яна "ідзе за сцягам". Яны таксама "ідуць за сцягам", утвараючы, паводле сумнай заўвагі аўтара, "хаўтурную працэсію рэспублікі". Ален лічыць, што праблема рабства была другасным пытаннем Грамадзянскай вайны, галоўнае — барацьба за ўладу (таму ён ніколі не закранае гэту тэму ў рамане), Грамадзянская вайна, на яго думку, развязала рукі федэральнаму ўраду, істотна ўмацаваўшы яго, і такім чынам паклала пачатак эпосе агрэсіўнага замежнапалітычнага курса, скіраванага на захоп усё новых і новых тэрыторый, эпосе бясконцых каланіяльных войн. Таму ён ставіць Грамадзянскую вайну ў адзін рад з іншымі захопніцкімі войнамі.

Амерыканскаму гістарычнаму раману пра Грамадзянскую вайну ўласціва агульналюдская маральная скіраванасць, калі пытанне гістарычнай праўдзівасці адыходзіць на другі план, галоўнае — выкрыццё жахлівай існасці вайны, любой вайны як сродку развязвання палітычных канфліктаў. У гэтым заключаецца высокі маральны патэнцыял амерыканскага гістарычнага рамана ХХ стагоддзя. У паказе вайны стваральнікі амерыканскага гістарычнага рамана працягваюць традыцыі Стывена Крэйна, які ў "*Пунсовым знаку гераізму*" выкрыў яе жорсткасць і бессэнсоўнасць, але таксама не адзначаў яе высокае гістарычнае прызначэнне. Гістарычны раман 30-х гадоў падкрэслена пацыфічны. У амерыканскім гістарычным рамане 20-30-х гадоў знікае прагрэсіўная гістарычная роля Грамадзянскай вайны ў жыцці краіны; вайна асуджаецца як спосаб развязвання палітычных канфліктаў.

У рамане Алена прасочваецца трансфармацыя адной з галоўных ідэй нацыянальнай міфалогіі – ідэі месіянскай ролі ЗША, да ўкаранення якой у масавую свядомасць далучыліся гісторыкі Бэнкрафт, Фук, Мохан. Ален пераасэнсоўвае ідэю нацыянальнай абранасці. Ён бачыць яе ў тым, што ЗША павінна стаць апорай міру ва ўсім свеце.

«*Бітва пры Аквіле*» – тыповы **romance**, які характарызуецца камернасцю ў паказе гістарычнай падзеі (Грамадзянская вайна ў ім існуе быццам бы па-за кадрам), акцэнтам на пачуццях і перажываннях герояў, як

галоўных, так і другарадных, аналізам іх унутранага свету; завостранасцю маральных праблем у рамане, стараннай прапрацоўкай мастацкай формы твора. Гістарычны раман У. Караткевіча «*Каласы пад сярпом тваім*» прысвечаны падзеям пярэдадня беларуска-польскага паўстання 1863-1864 гадоў. Але шырокай панарамы жыцця Паўночна-заходняга краю ў рамане няма. Гэта тыповы раман выхавання, і гістарычная рэальнасць узнаўляецца ў творы праз успрыманне яе Алесем Загорскім, адным з будучых удзельнікаў і кіраўнікоў паўстання, сябрам Кастуся Каліноўскага. Нарастае незадаволенасць беларускага і польскага дваранства існуючым ладам, выспяванне ідэалогіі паўстання паказана ў рамане праз рэканструкцыю і тонкі псіхалагічны аналіз свядомасці героя, складанай асобы будучага князя Загорскага, сістэмы яго паглядаў. Раман інтравертны, рамантычны па духу аповяду. Аўтар і спыняе яго напярэдадні гістарычных падзей 1863 года.

Варта адзначыць, што прынцып адлюстравання гісторыі ў "*Каласах…*" цалкам адпавядае прынцыпам паказу гістарычных падзей у амерыканскім гістарычным рамане ўвогуле, дзе гістарычныя падзеі, якім прысвечаны раман, заўсёды знаходзяцца па-за кадрам і паказаны толькі праз уплыў іх на лёсы людзей, якія насяляюць раманаву прастору, што і было паказана на прыкладзе аналізу рамана «*Бітва пры Аквіле*». Прадэманструем гэта падабенства праз аналіз яшчэ аднаго амерыканскага гістарычнага рамана, прысвечанага падзеі, якая вызначыла пералом у Грамадзянскай вайне - Геттысбергскай бітве.

Геттысбергская бітва была самай кровапралітнай у гісторыі войн XIX стагоддзя. Яна стала і самай важнай бітвай Грамадзянскай вайны, тым паваротным пунктам, пасля якога Поўдзень ужо больш не меў бліскучых перамог, страціў здольнасць да наступлення. Бітва стала пачаткам канца, прадвеснем Апаматакса. Відавочна, пісьменнікі, якія звяртаюцца ў сваёй творчасці да Грамадзянскай вайны, найбольш часта адлюстроўваюць гэту бітву.

Раман Макінлі Кэнтара «*Доўга помніць*» /1934/, адзін з найбольш вядомых раманаў пра Грамадзянскую вайну, прысвечаны Геттысбергскай бітве, якая пададзена праз успрыманне не яе ваенных удзельнікаў, а мірных жыхароў мястэчка, якія апынуліся ў віры баявых дзеянняў. Аўтару важна перадаць успрыманне найвялікшай бітвы Грамадзянскай вайны людзьмі, свядомасць якіх не была траўміравана жорсткімі баямі і таму захавала здольнасць да нармальнага чалавечага ўспрымання пачварнай

гістарычнай дзеі. Асноўная тэма рамана – чалавек і вайна, яе разбуральны ўплыў на асобу і жыццё чалавека. Аўтар гістарычна праўдзіва і псіхалагічна пераканаўча ўзнаўляе адносіны да вайны жыхароў невялічкага пенсільванскага мястэчка, ахопленага чадам ваеннай патрыятычнай істэрыі; выяўляе матывы іх патрыятычнай ваяўнічасці, паказвае, што не заўсёды імі рухае чыстая любоў да Звязу штатаў і імкненне хоць неяк захаваць яго. У кожнага пры гэтым ёсць і свой маленькі меркантыльны разлік ці псіхалагічная прычына, якая прымушае іх глядзець на ўласны удзел у вайне як на сродак самасцвярджэння. Кэнтар выводзіць на авансцэну герояў, якія не прымаюць вайну як сродак развязкі палітычных праблем і аказваюць ёй пасіўнае супраціўленне сваёй пацыфісцкай пазіцыяй, людзей, для якіх чалавечае жыццё ёсць найвялікшая каштоўнасць. Вайна іх вачыма ўспрымаецца перш за ўсё як бязлітасная машына знішчэння ўсяго жывога і нежывога. Зрэшты, вайна сапраўды аднолькава забівае і знішчае і тых, хто ёй шчыра служыць, і тых, хто ненавідзіць і адмаўляе яе. Зламаныя лёсы герояў рамана, якія супрацьстаялі вайне /Дэн, Ірэна, доктар Дафі /, загубленыя жыцці яе прыхільнікаў /Элі Хадлстана, Тая Фэннінга, сына адваката Орката/, парадаксальныя павароты сюжэта закліканы выявіць філасофію жыцця Макінлі Кэнтара, яго разуменне Грамадзянскай вайны як трагедыі краіны і яе народа, як прылады для разбурэння чалавечых лёсаў і істоты чалавека, як абсурду, які становіцца недарэчным сусветным абсурдам. У выяве вайны, у яе адмаўленні аўтар прытрымліваецца традыцый літаратуры «страчанага пакалення».

Пад канец кнігі абстрактны гуманізм героя церпіць паражэнне. Ён ідзе на фронт, каб ваяваць у войску Звязу, бо нельга застацца староннім назіральнікам, калі навокал бушуе вайна. У гэтай выснове, да якой аўтар прыводзіць свайго героя, відавочны водгук Кэнтара на першыя перамогі фашызму і яго злачынствы. Сваёй гуманнай ідэяй далучанасці чалавека да ўсяго, што адбываецца на Зямлі, і яго адказнасці за ўсё Дабро і Зло, што робіцца на ёй, Кэнтар апярэдзіў адзін з лепшых твораў амерыканскай і сусветнай літаратуры 30-х гадоў – раман Э. Хэмінгуэя «*Па кім звоніць звон*». Паказальна, што другое перавыданне кнігі ў Злучаных Штатах адносіцца да 1962 года, калі ідэі грамадзянскага служэння зноў заваявалі папулярнасць у крытыкі і чытача.

«*Доўга помніць*» – такі ж тыповы romance, як і гістарычны раман Х. Алена, і беларускі гістарычны раман «*Каласы пад сярпом тваім*».

Развіццё амерыканскага гістарычнага рамана ў XX стагоддзі суправаджаецца ўзмацненнем ролі гістарычных фактаў, імкненнем да больш дакладнага, поўнага іх узнаўлення ў рамане, абвяшчэння гістарычнай праўды галоўнай мэтай і каштоўнасцю гістарычнага рамана. Пад гістарычнай праўдай мелі на ўвазе дакументальнае фіксаванне гістарычных падзей, а таксама дакладнасць гістарычнай дэталі, найбольш поўнае ўзнаўленне інтэлектуальнай і эмацыйнай атмасферы эпохі, што прысутнічае ў творы. Дарэчы сусветная літаратурная сітуацыя на працягу амаль усяго XX стагоддзя характарызуецца ўстойлівай цікавасцю да літаратуры нявыдуманай, літаратуры факта, да літаратуры, у аснове якой — дакумент, прычым гэтая цікавасць толькі ўзмацняецца. Прычыны такой з'вы ў наступным: уплыў навукова-тэхнічных рэвалюцый, якія ўзвялі дакладныя веды ў абсалют, стомленасць чытача фармальнымі вынаходствамі мадэрнізму і постмадэрнізму, надзея адшукаць псіхалагічную стабільнасць у наш складаны час хоця б у дакладных фактах і інш.

У амерыканскай літаратуры XX стагоддзя зварот да дакументалістыкі бачыцца не толькі ў літаратурнай традыцыі, якая ўзыходзіць да сярэднявечча, але і ў рэвалюцыйных зменах духоўнага жыцця краіны, якія наступілі пасля заканчэння Першай сусветнай вайны. Агульная рэвізія сацыяльных, палітычных, ідэйных і маральных асноў і каштоўнасцей, што панавалі ў духоўным жыцці ЗША на працягу двух стагоддзяў, запатрабавала пераасэнсавання і пераацэнкі амерыканскай гісторыі. Найбольш актыўна працэс пераасэнсавання амерыканскай гісторыі ішоў у гістарычнай белетрыстыцы. У творах «дэбункераў», а таксама Бойда, Фаста, Эдмандса, Эрліха, Фута, якія звярнуліся да дакумента, псеўдадакумента, дзённікавых і эпісталярных форм дзеля перагляду ранейшых паглядаў на гісторыю ЗША, нараджаецца новая версія гісторыі краіны, якая атрымвае далейшае развіццё на працягу ўсяго стагоддзя.

У 60—70-я гады XX ст. цікавасць да дакументалістыкі ў прадстаўнікоў гістарычных жанраў была падмацавана з'яўленнем «новага журналізму», развіццём дакументальнай прозы і ўзмацненнем фактаграфічнасці літаратуры; выйсцем на літаратурную арэну пісьменнікаў, якія бачылі сваё мастацкае прызначэнне ў стварэнні раманаў-дакументаў, «небелетрызаваных раманаў» (Эйджы, Хэрсі, Капотэ, Вульф, Уэмба, Тэліз, Уікер, Брайан і інш.).

У XX стагоддзі ў каштоўнасці факта, дакумента пераканаюцца амаль усе аўтарытэтныя гістарычныя раманісты. Займальны раман Робертса «*Эрандэл*», падобны да навуковай працы, ён забяспечаны спісам літаратуры, вывучанай аўтарам дзеля яго напісання, і картай Абенакі, мясцовасці, па якой герой падарожнічаў. Як і ўсе іншыя гістарычныя раманы, «*Эрандэл*» дакладны ў праўдзівай гістарычнай дэталі, у падрабязным апісанні жыцця і побыту як мясцовых жыхароў, так і індзейцаў. Праўда, здараюцца і недахопы. Так, Джэймс Бойд у рамане «*Маршыруючы*» апісвае мужчынскія споднi са стрэлкамі, якіх мужчынская мода 60-х гадоў мінулага стагоддзя яшчэ не ведала. Але раман Бойда, адзін з першых амерыканскіх гістарычных раманаў новай фармацыі, менш за іншыя прэтэндуе на фактаграфічную дакладнасць адлюстраванага.

Тапаграфічная дакладнасць, з якой апісаны М. Кэнтарам Геттысберг і яго наваколле, што стала арэнай знакамітай бітвы, такая, што гэтыя месцы лёгка пазнаеш у раманах Шаары і Фаўлера, напісаных праз сорак гадоў. Гэта і будынак семінарыі з купалам, і дарогі, і поле пшаніцы, і Могілкавы пагорак, і горы ўдалечыні, і нават агароджа, і кусты бліз ручая — месцы сустрэч яго герояў. Сам раман «*Доўга помніць*» завяршаецца бібліяграфіяй, што налічвае больш за сотню назваў з аўтарскім указаннем таго, што яна ні ў якой меры не адлюстроўвае яго кола чытання і інфармацыі, што дапамаглі яму стварыць раман: так, немагчыма даць спасылкі на шматлікія вусныя аповеды сведак падзей, на доўгія гады азнаямлення з літаратурай па гэтай і сумежных тэмах, на публікацыі гістарычных аб'яднанняў з розных штатаў, дакументы ваеннага ведамства ЗША і Штатаў Канфедэрацыі, і г.д.

Гістарычны рамэнс (рамантычны раман) Алена Хэрві таксама прэтэндуе на дакументальную дакладнасць, і ў кнізе з'яўляецца падрабязны план вандраванняў героя з дэталёвым апісаннем мясцовасці, гарадоў і вёсак, праз якія ляжаў яго шлях, з дакладнай тапаграфіяй мясцовасці, і карты Даліны Вірджыніі, дзе разгортваецца дзеянне рамана. Дакументальная дакладнасць раманаў, створаных у другой палове XX стагоддзя, павялічваецца, факт, на першы погляд, пачынае цясніць вымысел. Прыхільнасць да факта, дакумента выяўляецца не толькі ў дакументальнай дакладнасці ўзнаўлення падзей, але і ў знешняй форме твора, якая ўсё больш падобна на статут дакументаў, аўтэнтычных ці фіктыўных. Говард Фаст піша свае раманы «*Ганарлівыя і вольныя*» і

*«Красавіцкую раніцу»* як мемуары чалавека, якога ніколі не было, гэтак жа і Р. Фаулер — «*Джыма Мандзі*». *«Бэрр»* Відала з'яўляюцца сімбіёзам выдуманых мемуараў і дзённікавых запісаў двух герояў, а «*1876*» складаецца з дзённікавых запісаў аднаго з іх.

Раман Чарльза Бауэра «*Так, я забіў Лінкальна*», нягледзячы на містычны ўступ, у якім дух Джона Бута звяртаецца да чытача з магілы, уяўляе сабою статут цалкам рэальных дакументаў з каментарыямі аўтара.

Па сваёй структуры раман Майкла Шаары «*Анёлы-забойцы*» больш падобны на дакументальны аповед, чым на раман. Ён складаецца з чатырох частак, кожная з якіх прысвечана падрабязнаму апісанню аднаго дня Геттысбергскай бітвы і папярэдняга вельмі важнага для выніку бітвы дня. Дзейнічаюць у ім амаль выключна гістарычныя персанажы. У прадмове да рамана аўтар дае падрабязную характарыстыку войск Поўначы і Поўдня, а таксама галоўных дзеючых асоб Геттысбергскай бітвы: генералаў Лі, Лонгстрыта, Армістеда, Худа, Пікета, палкоўніка Чэмберлена і іншых. Апісанне ў рамане насычана картамі, планамі баявых дзеянняў (іх васямнаццаць), змешчанымі ў патрэбным месцы аповяду. Сапраўды, «раман як гісторыя, гісторыя як раман»!

Задума рамана *«Сігнальныя вогнішчы»* Луіса Окінклоса з’явілася, па прызнанні аўтара, пасля прачытання дзённіка рэальнага чалавека. Да напісання рамана аўтар ішоў доўга, напачатку былі творы «*У хараստве лілеяў*» і іншы гістарычны раман, «*Уінтропская дамова*».

Такая ж тэндэнцыя назіраецца ў развіцці гістарычнага рамана і ў іншых, вельмі далёка адлеглых адна ад другой ў геапалітычным плане, краінах. Яна прысутнічае ў нямецкім і ўсходне-еўрапейскім раманах. Хацелася б адзначыць, што яна відавочна і ў развіцці беларускага гістарычнага рамана. Яркі прыклад — эвалюцыя мастацкага метаду У. Караткевіча, які стварыў натхнёны рамантычны раман *«Каласы пад сярпом тваім»* і хацеў раман працягнуць, але завяршыў рамантычную гісторыю пра жыццё беларуска-польскага дваранства напярэдадні паўстання Кастуся Каліноўскага дакументальным гістарычным творам «*Зброя*».

Беларускі гістарычны раман, такім чынам, з'яўляючыся часткай агульнага літаратурнага працэсу, увасобіў усе асаблівасці, уласцівыя парадыгме гістарычнага рамана ў XX стагоддзі, і прадэманстраваў агульныя рысы тыпалагічнага падабенства, што мы і даказалі праз параўнанне амерыканскага і беларускага гістарычных раманаў.

**Библиография:**


1. Aaron D., *An Unwritten War. American Writers and the Civil War*, New York 1973.
2. Allen H., *Action at Aquile*, New York 1938.
3. Millett F.B., *Contemporary American Authors*, New York 1944.
4. *Reader's Encyclopedia of American Literature*, red. G. Perkins, New York 2002.
5. *Scribner's Magazine,* XXXV-1904, Jan.-June.


## GENRE SIMILARITIES OF THE AMERICAN AND BELARUSIAN HISTORICAL NOVEL OF THE 20th CENTURY

### Summary


A great American writer N. Hawthorn pointed out at a new genre form in the American literature, which he called romance. Romance, according to Hawthorn, doesn't create a wide panorama of life but deals with the psychological life of the characters.

The article deals with two American historical novels: *"Action at Aquile"* by H. Allen and "*Long Remember*" by M. Kantor and one Belarusian historical novel – "*Seeds under Your Sickle*" by V. Korotkevich. As a result of the comparative analysis of these three novels we came to the conclusion that all of them belong to the genre form of romance.



**Keywords:** genre form, traditional novel, historical novel, philosophy of history, historical sense